## ПАСЛАННЕ НА РАЖДЖАСТВО ХРЫСТОВА ПАТРЫЯРХА МАСКОЎСКАГА І ЎСЯЕ РУСІ КІРЫЛА

## архіпастырам, пастырам, дыяканам, манахам і ўсім верным дзецям Рускай Праваслаўнай Царквы

**Узлюбленыя ў Госпадзе**
**Праасвяшчэнныя архіпастыры,**
**пачэсныя прасвітары і дыяканы,**
**богалюбівыя інакі і інакіні,**
**дарагія браты і сёстры!**

Сёння нашы храмы напоўнены людзьмі, якія прыйшлі праславіць Нованароджанае Богадзіця – Хрыста Спасіцеля, і Яго Прачыстую Маці – Дзеву Марыю. Раждجство Хрыстова – цэнтральная падзея ўсёй чалавечай гісторыі. Чалавек заўсёды шукаў Бога: але ва ўсёй паўнаце Бог Сам адкрыў Сябе чалавецтву толькі ва ўцялесненні Свайго Адзінароднага Сына. З прышэсцем Сына Божага – і Сына чалавечага – свет даведаўся, што Бог ёсць Любоў, а не толькі Вышэйшая Сіла, Бог ёсць Міласць – а не толькі Той, Хто справядліва карае, Бог ёсць крыніца жыцця і радасці – а не толькі грозны Суддзя, Бог ёсць Святая Троіца, унутраным законам жыцця Якога з'яўляецца таксама любоў, – а зусім не адзінокі Уладар свету.

І сёння мы святкуем падзею, якая карэнным чынам перамяніла ўвесь ход чалавечай гісторыі. Бог уваходзіць у самыя нетры чалавечага жыцця, становіцца адным з нас, бярэ на Сябе ўвесь цяжар нашых грахоў, чалавечых немачаў і слабасцяў – прыносіць іх на Галгофу, каб вызваліць людзей ад невыноснага цяжару. Бог з гэтага часу – не дзесьці ў непрыступных нябёсах, а тут, з намі, сярод нас. Кожны раз у час служэння Бажэсвеннай Літургіі прамаўляюцца словы «Хрыстос пасярод нас!» – і адказ: «І ёсць, і будзе!» Гэта яскравае сведчанне аб прысутнасці Самога Уцялесненага Бога – Хрыста Спасіцеля – сярод Сваіх верных. Рэгулярна прычашчаючыся Яго Святых Цела і Крыві, прыкладаючы намаганні да выканання Яго запаведзяў, мы ўваходзім у рэальныя зносіны з Ім, з нашым Спасіцелем, і атрымліваем прабачэнне грахоў.

Веруючыя ў Хрыста і верныя Яму вучні закліканы быць сведкамі яўленага ў Хрысце Царства Божага яшчэ ў час зямнога жыцця. На нас ускладзены вялікі гонар – жыць у гэтым свеце так, як жыў наш Настаўнік і Бог, сілаю Хрыстовай быць непахіснымі ў супрацьстаянні граху і злу, не слабець у руплівым здзяйсненні добрых спраў, не падаць духам у штодзённым намаганні па праабражэнню нашай грахоўнай прыроды ў новага, благадатнага чалавека.

Хрыстом Спасіцелем устаноўлены непарушны, абсалютны крытэрый шчырасці адносін да Бога – гэта наш бліжні. Прымаючы на сябе чужыя немачы, раздзяляючы боль і скруху, спагадаючы няшчасным і бяздольным, мы выконваем закон Хрыстоў

(Гал. 6:2) і ўпадабняемся Спасіцелю, Які ўзяў немачы нашы і прыняў на Сябе хваробы нашы (Іс. 53:4).

І немагчыма ў гэты радасны і светланосны дзень Хрыстовага Нараджэння, калі ўсё тварэнне ў здзіўленні прыпадае да ясляў Багадзіцяці, забываць пра іншых. Тая вялікая благадаць, якую мы сёння атрымліваем у нашых храмах, павінна багата праліцца і на тых, хто ўсё яшчэ за межамі Царквы і жыве паводле стыхій свету гэтага, а не паводле Хрыста (Кал. 2:8). Але калі мы з вамі не пойдзем насустрач – гэтая Добрая Вестка можа і не дайсці да іх; калі мы з вамі не адкрыем свае сэрцы, каб падзяліцца перапаўняючай нас радасцю, – яна можа ніколі не дакрануцца да тых, хто яе не мае, але хто гатовы яе прыняць.

Уцялесненнем Сына Божага чалавечая прырода ўзнесена на небывалую вышыню. Кожны з нас не толькі створаны «*паводле вобразу і падабенства Божага*», але праз Хрыста цяпер яшчэ і ўсыноўлены Богу: мы ўжо не «*чужынцы і не прыхадні, але суграмадзяне святых і дамачадцы Бога*» (Эф. 2:19). Пра гэтую блізкасць і адвагу да Бога гаворыць і малітва Гасподняя, у якой мы звяртаемся да Тварца як да роднага Айца Нябеснага.

Любое чалавечае жыццё бясцэннае: бо ж за яго заплачана Уцялесненнем, Жыццём, Смерцю і Уваскрасеннем Адзінароднага Сына Божага. Усё гэта яшчэ больш настойліва патрабуе ад нас з асаблівай паважлівасцю і ўвагай адносіцца да кожнага чалавека, не залежна ад таго, наколькі ён адрозніваецца ад нас. Паводле думкі святціцеля Маскоўскага Філарэта (Драздова), «*любоў ёсць жывы і дзейсны ўдзел у дабрабыце іншага*». Да гэтай дзейснай любові і хочацца перш за ўсё заклікаць усіх у гэтыя радасныя дні Раджджаства Хрыстовага: быць, паводле слова апостала Паўла, браталюбнымі адзін да аднаго, з пашанаю служыць адзін аднаму, у руплівасці не спыняцца, духам палымнець, Госпаду служыць! (Рым. 12:10-11, Яўр. 13:16).

Сардэчна віншую Вас з вялікім святам Раджджаства Хрыстовага. Бог любові і міру (2 Кар. 13:11) няхай даруе народу нашаму і кожнаму з нас мір і дабрабыт у Новым годзе.

**КІРЫЛ**

**ПАТРЫЯРХ МАСКОЎСКІ І ЎСЯЕ РУСІ**

Раджджаства Хрыстова
2013/2014 г.
г. Масква

**ПАСЛА́ННЕ НА РАЖДЖАСТВО́ ХРЫСТО́ВА ПАТРЫЯ́РХА МАСКО́ЎСКАГА І ЎСЯЕ́ РУСІ́ КІРЫ́ЛА**
**архіпа́стырам, па́стырам, дыя́канам, мана́хам і ўсі́м ве́рным дзе́цям Ру́скай Правасла́ўнай Царкві́**

**Узлю́бленыя ў Го́спадзе**
**Праасвяшчэ́нныя архіпа́стыры,**
**пачэ́сныя прасві́тары і дыя́каны,**
**богалюбі́выя і́накі і і́накіні,**
**дарагі́я браты́ і сёстры!**

Сёння на́шы хра́мы напо́ўнены людзьмі́, які́я прыйшлі́ прасла́віць Нованаро́джанае Богадзіця́ – Хрыста́ Спасі́целя і Яго́ Прачы́стую Ма́ці – Дзе́ву Мары́ю. Раждажство́ Хрысто́ва – цэнтра́льная падзе́я ўсёй чалаве́чай гісто́рыі. Чалаве́к заўсёды шука́ў Бо́га: але́ ва ўсёй паўнаце́ Бог Сам адкры́ў Сябе́ чалаве́цтву то́лькі ва ўцяле́сненні Свайго́ Адзінаро́днага Сына. З прышэ́сцем Сы́на Бо́жага – і Сы́на чалаве́чага – свет даве́даўся, што Бог ёсць Любо́ў, а не то́лькі Вышэ́йшая Сі́ла, Бог ёсць Мі́ласць – а не то́лькі Той, Хто справядлі́ва кара́е, Бог ёсць крыні́ца жыцця́ і ра́дасці – а не то́лькі гро́зны Суддзя́, Бог ёсць Свята́я Тро́іца, уну́траным зако́нам жыцця́ Яко́га з’яўля́ецца такса́ма любо́ў, – а зусі́м не адзіно́кі Улада́р све́ту.

І сёння мы святку́ем падзе́ю, яка́я карэ́нным чы́нам перамяні́ла ўвесь ход чалаве́чай гісто́рыі. Бог увахо́дзіць у са́мыя не́тры чалаве́чага жыцця́, стано́віцца адны́м з нас, бярэ́ на Сябе́ ўвесь цяжа́р на́шых грахо́ў, чалаве́чых не́мачаў і сла́басцяў – пры́но́сіць іх на Галго́фу, каб вы́зваліць людзе́й ад невыно́снага цяжа́ру. Бог з гэ́тага ча́су – не дзе́сьці ў непрысту́пных нябёсах, а тут, з на́мі, сяро́д нас. Ко́жны раз у ча́с служэ́ння Бажэ́свеннай Літургі́і прамаўля́юцца сло́вы “Хрысто́с пасяро́д нас!» – і адка́з: «І ёсць, і бу́дзе!» Гэ́та яскра́вае све́дчанне аб прысу́тнасці Само́га Уцяле́сненага Бо́га – Хрыста́ Спасі́целя – сяро́д Сваі́х ве́рных. Рэгуля́рна прычашча́ючыся Яго́ Святы́х Це́ла і Крыві́, прыкладаю́чы намага́нні да выкана́ння Яго́ за́паведзяў, мы ўвахо́дзім у рэа́льныя зно́сіны з Ім, з на́шым Спасі́целем, і атры́мліваем прабачэ́нне грахо́ў.

Ве́руючыя ў Хрыста́ і ве́рныя Яму́ ву́чні заклі́каны быць све́дкамі я́ўленага ў Хрысце́ Ца́рства Бо́жага яшчэ́ ў час зямно́га жыцця́. На нас усклада́зены вялі́кі го́нар – жыць у гэ́тым све́це так, як жы́ў наш Наста́ўнік і Бог, сі́лаю Хрысто́вай быць непахі́снымі ў супрацьстая́нні граху́ і злу, не слабе́ць у руплі́вым здзяйсне́нні до́брых спраў, не па́даць ду́хам у штодзённым намага́нні па праабражэ́нню на́шай грахо́ўнай пры́ро́ды ў но́вага, благада́тнага чалаве́ка.

Хрысто́м Спасі́целем устано́ўлены непару́шны, абсалю́тны крытэ́рый шчы́расці адно́сін да Бо́га – гэ́та наш блі́жні. Прыма́ючы на сябе́ чужы́я не́мачы, раздзяля́ючы боль і скру́ху, спагада́ючы няшча́сным і бяздо́льным, мы выко́нваем зако́н Хрысто́ў (Гал. 6:2) і прыпадабня́емся Спасі́целю, Які́ ўзяў не́мачы на́шы і прыня́ў на Сябе́ хваро́бы на́шы (Іс. 53:4).

І немагчы́ма ў гэ́ты ра́дасны і светлано́сны дзень Хрысто́вага Нараджэ́ння, калі́ ўсё тварэ́нне ў здзіўле́нні прыпада́е да я́сляў Богадзіця́ці, забыва́ць пра і́ншых. Та́я вялі́кая благада́ць, якую мы сёння атры́мліваем у на́шых хра́мах, паві́нна бага́та пралі́цца і на тых, хто ўсё яшчэ́ за ме́жамі Царквы́ і жыве́ паво́дле стыхі́й све́ту гэ́тага,

а не паво́дле Хрыста́ (Кал. 2:8). Але́ калі́ мы з ва́мі не по́йдзем насу́страч – гэ́тая До́брая Ве́стка мо́жа і не дайсці́ да іх; калі́ мы з ва́мі не адкры́ем свае́ сэ́рцы, каб падзялі́цца перапа́ўня́ючай нас ра́дасцю, – яна́ мо́жа ніко́лі не дакрану́цца да тых, хто яе́ не ма́е, але́ хто гато́вы яе прыня́ць.

Уцяле́сненнем Сы́на Бо́жага чалаве́чая пры́рода ўзне́сена на небыва́лую вышыню́. Ко́жны з нас не то́лькі ство́раны «*паво́дле во́браза і падабе́нства Бо́жага*», але́ праз Хрыста́ цяпе́р яшчэ́ і ўсыно́ўлены Бо́гу: мы ўжо не «*чужы́нцы і не пры́хадні, але́ суграмадзя́не святы́х і дамача́дцы Бо́га*» (Эф. 2:19). Пра гэ́тую блі́зкасць і адва́гу да Бо́га гаво́рыць і малі́тва Гаспо́дняя, у якой мы звярта́емся да Тварца́ як да ро́днага Айца́ Нябе́снага.

Любо́е чалаве́чае жыццё́ бясцэ́ннае: бо ж за яго́ запла́чана Уцяле́сненнем, Жыццё́м, Сме́рцю і Уваскрасе́ннем Адзінаро́днага Сы́на Бо́жага. Усё гэ́та яшчэ́ бо́льш насто́йліва патрабу́е ад нас з асаблі́вай пава́жлівасцю і ўва́гай адно́сіцца да ко́жнага чалаве́ка, не зале́жна ад таго́, нако́лькі ён адро́зніваецца ад нас. Паво́дле ду́мкі святі́целя Маско́ўскага Філарэ́та (Дразд́ова), «*любо́ў ёсць жывы́ і дзе́йсны ўдзел у дабрабы́це і́ншага*». Да гэ́тай дзе́йснай любо́ві і хо́чацца перш за ўсё заклі́каць усі́х у гэ́тыя ра́дасныя дні Раджджаства́ Хрысто́вага: быць, паво́дле сло́ва апо́стала Па́ўла, браталю́бнымі адзін да аднаго́, з паша́наю служы́ць адзін аднаму́, у руплі́васці не спыня́цца, ду́хам палымне́ць, Го́спаду служы́ць! (Рым. 12:10-11, Яўр. 13:16).

Сардэ́чна віншу́ю Вас з вялі́кім свя́там Раджджаства́ Хрысто́вага. Бог любо́ві і мі́ру (2 Кар. 13:11) няха́й дару́е наро́ду на́шаму і ко́жнаму з нас мір і дабрабы́т у Но́вым го́дзе.

**КІРЫ́Л**

**ПАТРЫЯ́РХ МАСКО́ЎСКІ І ЎСЯЕ́ РУСІ́**

Раджджаство́ Хрысто́ва
2013/2014 г.
г. Масква